■ Сямейная палітыка

# КАЛІ ЗА НЯНЬКУ — ТАТА

## 6 з 10 мужчын падтрымліваюць ідэю «дэкрэтнага» водпуску для бацькаў

**Каб вывучыць грамадскую думку наконт кароткатэрміновага водпуску для татаў, Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ ў красавіку — маі гэтага года правёў сацыялагічнае апытанне. Выбарка склала 1000 рэспандэнтаў, ахоплена 78 населеных пунктаў — ад абласных гарадоў да вёсак.**

На пытанне «Як вы ставіцеся да магчымасці ўвядзення бацькаўскага водпуску пры нараджэнні дзіцяці?» 66,2 працэнта адказалі, што падтрымліваюць. Сярод мужчын станоўча адказалі 61,2 працэнта, сярод жанчын — 70,3. Пры гэтым 43,9 працэнта рэспандэнтаў запэўнілі, што іх сям'я скарысталася б такім «дэкрэтным», калі б ён быў прадугледжаны заканадаўствам. Найбольшая доля станоўчых адказаў (амаль палова) прыпадае на катэгорыю асоб ва ўзросце ад 30 да 44 гадоў.

Якім будзе бацькаўскі водпуск? Плануецца, што яго будуць даваць на тэрмін да 14 дзён. Узяць яго можна аднаразова, у першыя паўгода пасля нараджэння дзіцяці — у той жа час, калі маці знаходзіцца ў сацыяльным водпуску.

— Мы ведаем, што гэта найбольш складаны перыяд, калі жанчына мае патрэбу ў старонняй дапамозе. Не заўсёды дапамога ёсць з боку бабуль ці іншых сваякоў. І самы блізкі чалавек — тата — павінен мець магчымасць правесці гэты час з сям'ёй, — тлумачыць **намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА.**

Абавязковы бацькаўскі водпуск заканадаўча замацаваны ў 25 краінах. Абавязковы ён перш за ўсё для наймальнікаў: гэта імператыўнае права работніка скарыстацца дадзенай гарантыяй, і працадаўца мусіць яе забяспечыць. Але 14-дзённы «дэкрэт» для беларускіх татаў не будзе аплачвацца (па аналогіі з водпускамі па сямейных абставінах, на перыяд вучобы).

Трэба сказаць, што сем'ям з дзецьмі ўдзяляецца асаблівая ўвага. Больш за 553 тысячы малых ахоплены сістэмай дзяржаўных дапамог — гэта амаль кожнае трэцяе дзіця. Дзецям ранняга ўзросту забяспечваюць бясплатнымі прадуктамі харчавання. У першым паўгоддзі такую падтрымку мелі восем працэнтаў малых да двух гадоў. Сярэдні кошт месячнага набору прадуктаў харчавання склаў каля 85 рублёў.



Вельмі запатрабаваная паслуга сацыяльнай нянькі. За студзень — чэрвень ёй скарысталася 1881 сям'я (з іх 152 — з дзецьмі-інвалідамі). Гэта амаль столькі ж, колькі за ўвесь мінулы год (у 2016-м нянькі прыходзілі ў 1985 сем'яў).

Працягваецца праграма сямейнага капіталу. На 1 жніўня ў Беларусбанку было адкрыта 40,3 тысячы дэпазітных рахункаў на агульную суму больш за 403 мільёны долараў. Марына Арцёменка адзначае, што ўсе гэтыя меры дазволілі павысіць колькасць трэціх і наступных дзяцей у сем'ях. Так, калі ў 2014-м такіх дзяцей нарадзілася 17,3 тысячы, то летась — 22 тысячы. А колькасць шматдзетных сем'яў павялічылася да 91,6 тысячы.

Грашовыя выплаты прадугледжаны таксама для сем'яў, што ўсынавілі малых. **Маргарыта МАЦВЕЕНКА, начальнік аддзела сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства Міністэрства адукацыі**, заўважае, што гэта дазваляе і падтрымаць сям'ю матэрыяльна, і адзначыць тую высакародную справу, якую яна зрабіла. Выплаты на ўтрыманне сёння забяспечаны больш як шасці тысячам непаўналетніх — каля 90 працэнтаў ад усіх усыноўленых хлопчыкаў і дзяўчатак.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
lubneuskaya@zviazda.by

■ У пачатку было слова

# Не толькі карціны, але і стрададрукі

**Нацыянальны мастацкі музей рыхтуе адмысловую выстаўку, прысвечаную 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.**

Тут будуць прадстаўлены самыя рэдкія выданні з кніжнага збору музея, які налічвае каля двух соцень адзінак. Некаторыя прадметы датуюцца пачаткам XVIII стагоддзя, а самая старая з беларускіх кніг калекцыі — Евангелле з сігнатурамі 1600 года, надрукаваная ў Вільні ў друкарні братоў Мамонічаў, — будзе ўпершыню прадстаўленая публіцы пасля рэстаўрацыі. Над аднаўленнем гэтага выдання зараз працуе вядомы рэстаўратар Андрэй Крапіўка.

Выстаўка рарытэтаў кніжнай калекцыі музея стане даступнай для наведвальнікаў 20 верасня.

— Наш кніжны збор пачаў фарміравацца ў 1954 годзе, калі ў фонды паступіла рукапіснае Евангелле XVI стагоддзя, — расказаў **генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір ПРАКАПЦОЎ.** — Калекцыю паступова склалі рукапісныя кнігі, выданні, надрукаваныя лацінскім шрыфтам і кірыліцай у XVI — пачатку XX стагоддзя на тэрыторыі Беларусі, Украіны, у Маскве і Санкт-Пецярбургу. Фарміраванне і папаўненне калекцыі было ў многім звязана з экспедыцыйнай дзейнасцю супрацоўнікаў музея пасля вайны. У закрытых касцёлах, цэрквах разам з каштоўнымі творамі мастацтва знаходзілі не менш каштоўныя кнігі, некаторыя выданні мы атрымалі ў падарунак, а некаторыя набылі.

Мастацкі музей сёння можна назваць адной з самых яркіх пляцовак, дзе адбываюцца прэзентацыі кніг, тут таксама працуюць над падрыхтоўкай адмысловай серыі «Славутыя мастакі з Беларусі», у межах якой ужо пабачыла свет больш як 20 выданняў. Кнігамі музей праз два гады адзначыць і сваё 80-годдзе: распрацоўваецца канцэпцыя каля дзесятка грунтоўных фаліянтаў, што распавядуць пра зборы гэтай багатай на каштоўнасці ўстановы.

Неварта забывацца і на мастацкую скарыніяну. Так, як заўважыў Уладзімір Пракапцоў, у фондах Нацыянальнага мастацкага музея захоўваецца, а ў яго асноўнай экспазіцыі прадстаўляецца нямала твораў-прысвячэнняў першадрукару. Гэта, у прыватнасці, работы Арлена Кашкурэвіча, Міхаіла Савіцкага, Анатоля Тычыны, Гаўрылы Вашчанкі, Уладзіміра Крукоўскага, Васіля Шаранговіча і многіх іншых творцаў, якія натхняліся вобразам Францыска Скарыны і галядоўнікаў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** vesialuha@zviazda.by

# Дзеці ў цэнтры ўвагі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таксама ў гандлёвых цэнтрах высадзіцца дэсант актывістаў Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі ратавальнікаў-пажарных. Яны будуць раздаваць пакупнікам брашуры «Што рабіць, калі...», дзе апісаны алгарытм дзеянняў пры разнастайных надзвычайных сітуацыях, буклеты, памяткі для бацькоў, каляндарыкі.

### Вучэбная эвакуацыя

«Першы званок» у школах сёлета прагучыць 1 верасня. Гэтая дата і стане пачаткам другога этапу акцыі.

— Прычым ужо ў гэты дзень на школьных лінейках і класных гадзінах супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Таварыства ратавання на водах правядуць з вучнямі прафілактычныя гутаркі, — працягвае Вольга Мельчанка. — Яны раскажуць пра асноўныя прычыны пажараў, падкажуць, як папярэдзіць бяду і як дзейнічаць пры абстаноўцы, якая пагражае жыццю і здароўю. Вучням пакажуць тэматычныя стужкі, знятыя паводле рэальных фактаў. А для тых, хто пакуль што спасцігае навуку ў пачатковай школе, падрыхтаваны спецыяльныя мультфільмы. Ім жа раздадуць шмат наглядной прадукцыі.

Акрамя таго, з 1 па 16 верасня ва ўсіх школах Беларусі ратавальнікі дадуць тэматычныя «Урокі бяспекі». Завітаюць яны і на бацькоўскія сходы.

Але на адной тэорыі навучанне не спыніцца. У кожнай школе абавязкова будзе арганізавана вучэбная эвакуацыя.

### Пра бяспеку — праз інтэрактыўнасць

А 18 верасня ратавальнікі завітаюць у дзіцячыя садкі.

— Для нас гэтая катэгорыя дзяцей — бадай што самая спецыфічная, — разважае Вольга Мельчанка. — Кнігі і буклеты, якія можна падарыць першакласнікам, дашкалятам, якія не ўмеюць чытаць, дапамогуць мала. І таму застаецца толькі гуляць на блізкіх асацыяцыях, каб малыя вучыліся бачыць сувязь паміж нейкім дзеяннем і яго вынікам. Тут мы выкарыстоўваем тэатралізаваныя пастаноўкі і інтэрактыўныя гульні. Самае галоўнае для нас — навучыць выхаванцаў садкоў, як трэба сябе паводзіць у надзвычайнай сітуацыі і як клікаць на дапамогу. Не забудземся і пра бацькоў: з імі пагутараць ратавальнікі і правядуць навучальныя інструктажы, а таксама пакажуць тэматычныя відэастужкі.

Дарэчы, па стане на 15 жніўня ў Беларусі адбыліся 3264 пажары, на якіх загінулі 263 чалавекі. Сярод іх — чацвёра дзяцей.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
schklennik@zviazda.by

### ТЫМ ЧАСАМ

На пачатку тыдня ў інтэрнэт трапілі шакуючыя здымкі. На знешнім баку парэнчаў балкона сталічнага гмаха павіс хлопец. Яго ў гэты час фатаграфаваў іншы падлетак. А пад навасечаным «руферам» было 26 павярхоў бездані.

— Пакуль не высветлены асобы гэтых двух непаўналетніх, — кажа **афіцыйны прадстаўнік ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр ЛАСТОЎСКІ.** — Я гутарыў з відавочцамі, але ў міліцыю яны вырашылі не звяртацца. Яны мяркуюць, што гэта хтосьці з мясцовых жыхароў, і таму хочуць самі паразмаўляць з іх бацькамі.

Менавіта апошнія і павінны кантраляваць паводзіны сваіх дзяцей. Бо акрамя іх, гэта не зробіць ніхто. Тым больш, што і іх могуць прыцягнуць да адказнасці за неналежнае выхаванне. А самі падлеткі рызыкуюць трапіць на ўлік у камісію па справах непаўналетніх.

■ За падзеяй

# КВЕТКІ ДЛЯ НАРОДНАГА ПАЭТА

## Дзеячы культуры ўшанавалі памяць Якуба Коласа

**Ужо па традыцыі ў дзень памяці паэта, каля яго магілы на Вайсковых могілках сталіцы з кветкамі ў руках сабраліся пісьменнікі, мастакі, навукоўцы, журналісты, бібліятэкары. Арганізатарамі памінальнага мітынгу сталі супрацоўнікі Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.**

Прыйсці на магілу да народнага беларускага пісьменніка і паэта, як да блізкага чалавека, у гадавіну з дня яго смерці (Якуба Коласа не стала 13 жніўня 1956 года), усмомніць нябожчыка як творцу і як чалавека... З прамовамі выступілі **дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, першы намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ,** першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах, літаратары Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Віктар Шніп, Уладзімір Мазго, скульптар Іван Міско. Дарэчы, апошні падчас свайго кароткага выступлення выказаў прапанову надаць сталічнаму парку імя Горкага імя Якуба Коласа. Менавіта на гэтым месцы да Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся дом паэта.

— Якуб Колас заўсёды азіраўся на пройдзены шлях, і яму здавалася, што ён мог зрабіць значна больш, — зазначыла **дырэктар літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ.** — Але мы ўпэўнены, што Колас паспеў выканаць надзвычай карысную працу і шмат пакінуў нам, нашчадкам. Мы ж павінны захоўваць яго ідэі і жыць у адпаведнасці з запаветамі, што ён пакінуў на старонках сваіх твораў.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ На слыху

# Беларусы пацярпелі ў ДТЗ у Калужскай вобласці

**У дарожна-транспартным здарэнні, якое адбылося ў Калужскай вобласці, загінуў адзін грамадзянін Беларусі, дзевяць нашых суайчыннікаў былі шпіталізаваны.**

Консульская служба пасольства Беларусі ў Расіі са спасылкай на інфармацыю ДІБДР паведаміла, што на 138-ым кіламетры Калужскай шашы аўтадарогі Масква—Малаяраславец—Рослаўль адбылося ДТЗ з удзелам двух транспартных сродкаў, якія маюць беларускую рэгістрацыю. Усе пацярпелыя беларусы шпіталізаваны ў Малаяраславецкую цэнтральную раённую бальніцу і Калужскую абласную бальніцу. Адзін з іх знаходзіцца ў рэанімацыі ў цяжкім стане. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, усе пацярпелыя пражываюць у Гомельскай вобласці, за выключэннем аднаго жыхара Гродзенскай вобласці. Загінулы з'яўляўся жыхаром Калінкавічаў. Ідзе ўдакладненне звестак па астатніх пасажырах (у транспартных сродках знаходзілася 37 грамадзян Беларусі), інфармацыя накіроўваецца ў абласныя УУС для інфармавання сваякоў. Консульская служба пасольства знаходзіцца ў пастаянным кантакце з медыцынскімі ўстановамі, УУС і ДІБДР рэгіёна. Паводле папярэдняй інфармацыі, кіроўца аўтамабіля «Фольксваген Мультывэн» выехаў на паласу сустрэчнага руху, затым у кювет, што пацягнула датычнае сутыкненне аўтамабіля «Мерседэс-Бенц» (Тонар) з аўтобусам «Неаплан».

# Чарговае здарэнне з гадзюкай

**У Рагачоўскім раёне гадзюка ўкусіла семігадовую дзяўчынку.**

Гэта ўжо трэці выпадак за тыдзень, калі людзі сустракаюцца з гэтай змяёй у населеных пунктах, і другі — калі цярпяць ад іх (у мінулым нумары мы пісалі пра ўкус 10-гадовага хлопчыка ў сталіцы).

Інцыдэнт адбыўся за некалькі кіламетраў ад Рагачова ў дачным кааператыве. Вядома, што дзяўчынка прыехала пагасціць да бабулі. Адразу пасля таго, што здарылася, пацярпелая была шпіталізавана ў рэанімацыйнае аддзяленне Рагачоўскай цэнтральнай раённай бальніцы. Для далейшага лячэння дзяўчынку перавялі ў Гомельскую абласную клінічную бальніцу, дзе яна знаходзіцца дагэтуль. Стан пацыенткі стабільны, сярэдняй ступені цяжкасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by